Сяргей Рублеўскі



...Трэба мець мужнасьць,
каб адцурацца зыркай, добра ўбітай
людзьмі сьцяжыны....

# Віцебскія эцюды

## Просты кут Казіміра

Надарылася мне ў Кёльне паглядзець рэтрасьпектыўную выставу Казіміра Малевіча. Бадай, усё, што стварыў славуты мастак, ды яшчэ палотны, кераміка вучняў... Здавалася, канца ня будзе абвешаным карцінамі сьценам. А я з цікавасьцю доўжыў і доўжыў свой шлях ад аднаго твору — да другога, ад аднаго, існага ўсясьвету, да другога, рукатворнага, вядома ж, менш дасканалага. На перападах вышыняў кружылася галава. А спыніўся я, вядома ж, ля знакамітага чорнага і менш знакамітага чырвонага квадратаў. І доўга стаяў, асабліва перад «Чорным квадратам», каб паглынуць памяцьцю ўсе ягоныя адметнасьці, усе драбніцы, якія ня менш, чым канцэпцыя, рэпрэзентуюць аўтара.

І тады падумалася мне: а чаму квадрат? Чаму не трохкутнік ці, скажам, простакутнік або эліпс? Адказы на гэтыя пытаньні я пачаў шукаць пазьней.

Як жа — трохкутнік... Перакулены ўніз вяршыняю, ён нагадвае прыўкрасныя жаночыя вабноты. А хіба мог даверыцца такой натуральна-немінучай залежнасьці чалавек, які ўпусьціў у душу сьцюдзёны подых Сусьвету.

А калі трохкутнік вяршыняй уверх, дык гэта — ні даць, ні ўзяць — папераджальны дарожны знак. Я ня ведаю, ці былі такія ў пару Казіміра, але якая розьніца, калі ёсьць у нашую.

Аніяк ня мог гэта быць і аточаны гнуткім багетам чорны эліпс. Ён бы немінуча лучыў асацыяцыямі з рэалістычнымі партрэтамі такой формы, якія былі распаўсюджаныя ў ранейшых стагоддзях. І гледачу карцела б пабачыць падысподам чорнай фарбы абрысы якой-небудзь вытанчанай жаночай галоўкі з мудрагелістай вабнай фрызурай. Цяжка было б пазбавіцца аблуды, што на гэтым эліпсоідным палатне не запэцкана выкшталцоная выява. А Казіміру якраз жа і хацелася ацурацца звыклага кантэксту мастацтва, унікнуць стэрэатыпных людскіх адметнасьцяў. Казюк, напэўна, як я сёньня, зразумеў у свой час, што кожны творца мастацтва або старанна, да драбніцаў, паўтарае Божы сьвет, або прыдумвае свой, а ў ім усё проста ці ўскосна — пра сябе, нават пра сваю падсьвядомасьць. Вось нядаўна я напісаў аповед пра тое, як чалавек пачаў ператварацца ў дрэва. «Ты гэта пра сябе?» — зусім сур'ёзна спытаў у мяне пры сустрэчы адзін выбітны літаратар. Спачатку я быў агаломшаны і нават агледзеў рукі-ногі, а потым супакоіўся і падумаў: а чаму ж не пра мяне, тэкст жа — прадукт майго думаньня, у ім — радзімкі маёй душы, мае сумнеў, надзея, роспач...

Вось так было, напэўна, і з Казімірам, калі ён і ў зусім абстрактных выявах убачыў раптам прыкметы сваёй асобы. А ўсё таму, што свой сьвет ствараеш усьлед за Першаісным Яснавяльможным Творцам, што і сам ёсьць яго тварэньнем. О, якой прыкрасьцю кладзецца на душу гэтая другаснасьць... Які калючы намёк на сваю па сутнасьці нікчэмнасьць перад абсягамі вечнасьці!

І, напэўна, прыйшло да Казіміра адкрыцьцё, што на ўсім прыўкрасным Божым нідзе няма аўтарскага знаку, шыльдачкі, подпісу, кляйма — ні на дрыготкім сьвятле сьвітанку, ні на галаску сінічкі, ні на вусіку мятліка. Бо ня мае Вялікі Творца свайго «Я», ды і як яго мець, калі поплеч анікагусенькі, толькі гулкі подых чорнай касьмічнай бездані. І агарнула, відаць, Казімірава сэрца тужлівая нэндза, а душу — адчай ад прыкрай несуладнасьці з тым, што наўкола. І тады ён узяў чорную фарбу і затушыў вонкавае сьвятло, каб глядзець на сьвет толькі ўнутраным зрокам і адмяраць прастору толькі абсягамі душы. Трэба мець мужнасьць, каб адцурацца зыркай, добра ўбітай людзьмі сьцяжыны.

Вось крыху і праясьнілася, а ўсё ж не дае спакою пытаньне: чаму тады квадрат, а не які іншы простакутнік? Найхутчэй за ўсё таму, што апантаны творца мусіў пазьбегнуць якой бы там ні было выпадковась-ці, бо ўзвычайным

простакутніку тоіцца незьлічоная колькасьць варыя-цыяў суадносінаў даўжыні і шырыні. У квадраце яна нязьменная, у пэўным сэнсе ідэальная. І гэта, бадай, найбольш значнае запазычаньне Казіміра ў Айца-Творцы. А ў астатнім — роспачнае адрачэньне, ацураньне звадак паўтарыць існае.

...Стаяў я ля сьцяны, узіраўся ў чорны квадрат і нічога ня бачыў у яго паглынальным віры — ні зыркіх скокаў сонечных промняў па дыяментах расы, ні віцебскага ультрамарыну нябёсаў, ні асьляпляльнага бляску маланкі, ні чаго яшчэ. А ўсё таму, што з гэтым ідэальна вымераным чорным прадоньнем лучылася толькі прастора Казіміравай душы, толькі яе разлогі, узараныя, як і ва ўсіх людцаў, гострымі нарогамі жарсьцяў. І чаго я не магу зразумець, дык гэта недарэчнай слабасьці Казюка, які спакусіўся намаляваць аж чатыры, ці колькі сваіх чорных квадратаў. Нібыта ў яго было чатыры, ці колькі душаў.

А яшчэ тады ў Кёльне я зьвярнуў увагу на тое, што час ужо разышоўся па чорнай фарбе сваёй імклівай павуцінкай трэшчынак. І напэўна, падумаў я, хто-небудзь убачыць праз гэтую мярэжку рэмб-рантаўскую Данаю, ці Мадонну спадара Рубенса, ці яшчэ што непаўторнае.

Калі я пісаў гэтыя згадкі, па тэлевізіі перадалі, што знайшоўся яшчэ адзін варыянт «Чорнага квадрату». Таксама з павуцінкай трэшчынак. А калі дазналіся мастацтвазнаўцы, што карціна напісаная рукою Казі-міра Малевіча, дык тут жа абʼявілі яе нацыянальным набыткам. Людзі маюць звычку ўсё абагульняць і прысабечваць — і белы свет, і «Чорны квадрат».

## Хасідская загагуліна Марка

Зусім не арыгінальны Марк Шагал у тым, што займеў сусьветную вядомасьць праз звужаную браму нацыянальнай адметнасьці. Звыклы шлях: менавіта ў тваёй душы, у тваім народзе, у тваёй веры — код Вялікага Стварэньня.

Другі бок — наколькі ў гэтай вядомасьці ён зразумелы іншым народам.

Недасьведчаны, будзённы чалавек адразу спытае: а чаму ў Марка людзі лётаюць над горадам? Пачне з самай простай нязвыкласьці.

Я і сам у юнацтве вярэдзіў сябе такім пытаньнем. І знайшоў на той узрост натуральны адказ: таму што яны закаханыя. І гэта таксама праўда.

Наогул творы Шагала, які ўзрос у хасідскім асяродку і ўсе праявы жыцьця звык вытлумачваць паводле Торы, таксама могуць быць па-тлумачаныя па-рознаму, у залежнасьці ад прачытаньня.

Марк, як і любы сьмяротны чалавек, відавочна, ніякавеў перад сьвятым тэкстам. І нават больш, чым любы, бо нязводна адчуваў на сабе ўсьвядомлены грэх парушэньня Маісеевага запавету — узяўся за

Божае, асьмеліўся маляваць тое, што на небе, на зямлі і на вадзе. І, вядома, як праўдзівы юдэй дужа пакутваў. Але зноў і зноў паддаваўся сваёй зямной слабасьці, людскому блазнаваньню. Адчуваньне граху засела ў ягонай душы балючай стрэмкай. Каб прытушыць гэты боль, Марк падсьвядома нівеляваў відарыснае і вярбальнае. Па сутнасьці ён мкнуўся ня ўзвысіцца ў сваім асяродку, а зраўняцца з выкшталцонымі мужамі, якія праводзілі жыцьцё ў чытаньні-тлумачэньні Торы ды іншых сакральных кніг. Ягоныя выявы выструніліся да эфемернай субстанцыі думкі, калі ня мае аніякага значэньня гравітацыя, трохмернасьць прасторы, анатамічная структура чалавечага цела, бу-дзённая прадвызначанасьць рэчаў. Толькі размаітасьць каляровага сугучча, як неадольнае зьдзіўленьне перад веліччу Божага сьвету, пульсуе ў праёме рамы ў рытме сэрцабіеньня. Слабы ў сваёй велічы чалавек...

Я ўгледзеўся, як на адной з карцінаў Марк намаляваў мінору. Здаецца, ворах ахінаў яго душу ад «дотыку» да культавай рэчы. І тады ён саступіў вярбальнаму. Выява міноры нібыта складзеная, счэпленая з загагулінаў ды кручкоў, якія вельмі нагадваюць літары іўрыцкага альфабэту. Марк нібыта не намаляваў, а накрэсліў сямісьвечнік.

Аднойчы, калі выпала карэнным чынам перайначваць жыцьцё, ён скарыстаўся нагодай атрымаць благаславеньне ў Шнеерсона, славутага хасідскага рэбе з Любавічаў.

Адбыўся прыкладна такі дыялог:

— Дык ты хочаш ехаць у Петраград, сын мой? Думаеш, там вам будзе лепш? Што ж, благаслаўляю цябе, сын мой. Едзь.

— Але, рэбе, мне больш хочацца застацца ў Віцебску. Разумееце, там жывуць мае бацькі і бацькі жонкі, там...

— Ну, што ж, сын мой, калі табе больш падабаецца ў Віцебску, благаслаўляю цябе, заставайся.

Шмат яшчэ пра што карцела Марку запытацца ў строгага рэбе, але ён не асьмеліўся, пахінуўся бокам да дзьвярэй, нібы зьніякавелы школьнік. Не хапала яшчэ завесьці гаворку пра Хрыста, вобраз якога вярэдзіў тым часам душу мастака.

Наогул, якія размовы, калі гранічна проста зацемлена: едзь, сын, хоць на поўнач, хоць на поўдзень, хоць куды, а хочаш — заставайся дома, якая розьніца, калі ты для нашага супольніцтва ўжо адрэзаная скібачка.

Як пазьней высьветлілася, такія крояць і з парыжскага бохану. Постімпрэсіяністы, абстракцыяністы, якія туліліся ў горадзе мастакоў, хоць і з іншых прычынаў, але таксама ня бралі ў разьлік трохмерную простасьць прасторы, будову чалавечых цягліцаў, будзённую прадвызначанасьць рэчаў. У Марку яны прызналі свайго. Хоць такая ўцеха ўсяго толькі ў «другім Віцебску».

А над нашым горадам і сапраўды, здараецца, высьпявае надзвычай пераканаўчы ультрамарын нябёсаў, і тады міжволі задумваешся: дык чым жа было для Марка віцебскае неба?

Прыпірышчам самотнікаў, знакавым прадвесьцем абяцанай зямлі,

непарушным місіянскім надзелам. І гэтую прастору мары зноў і зноў імкнуўся абжыць чарадзейны мастак. Ягоны дзед-хасід, затурканы местачковымі згрызотамі, ускарабкваўся на дах, на комін ня столькі дзеля таго, каб быць бліжэй да Бога, колькі дзеля таго, каб ацурацца прыкрых будзённых звадак, якія замінаюць думаць пра вечнае. На небе не накрэсьліш рысу аселасьці, там не настрашыш пашпартавым рэжымам. Там ніхто ня дасьць у крыўду. Ды і каму, калі на ўзвышку блакіту толькі літасьцівы Божа ды выбраныя ім (а на карцінах — рукою Марка) людцы. У юнацтве, калі душу Шагала ахоплівала гнятлівая трывога, страх сацыяльнага абагульненьня, ён сьніў, што, нібы маленькі, хаваецца пад ложкам, або на даху, лічы, на небе.

Я мала бачыў арыгіналаў карцінаў апантанага Марка. Затое ўволю нагледзеўся на ягоныя вітражы ў царкве сьвятога Стэфана ў Майнцы, у горадзе, усслаўленым Гутэнбергам першай у сьвеце выдрукоўкай Бібліі.

Мяне чакалі, пара было сыходзіць, а я ня мог адарваць ад вітражоў вачэй. Блакітнае і густое, нібы малочны туман, сьвятло лілося ў маю душу, не раўнуючы як вярбальны эфір Сьвятога пісаньня. Я думаю, што Марк калі-нікалі пачуваў сябе шчасьлівым чалавекам.

Гавораць, ён памёр у ліфце, на ўздыме. Па дарозе на неба.